**Г. Клімовіч**
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

# ІДЭІ НЕАТАМІЗМУ Ў БЕЛАРУСКАЙ РЭЛІГІЙНА-ФІЛАСОФСКАЙ ДУМЦЫ

Тэматыка філасофскага дыскурсу ў творчасці беларускіх аўтараў ХХ ст., негледзячы на даволі блізкую часовую адлегласць, яшчэ недастаткова распрацаваная ў асяроддзі айчынных гісторыкаў філасофіі. Так па-за ўвагай даследчыкаў застаюцца імёны, якія належаць прадстаўнікам ідэалістычнай традыцыі на тэрыторыі Беларусі, сярод якіх трэба адзначыць такіх аўтараў як а.Фабіян Абрантовіч, а.Язэп Германовіч, а.Ян Тарасевіч, Дамінік Анісько, а.Чэслаў Сіповіч, а.Пётр Татарыновіч, а.Леў Гарошка, а.Тамаш Падзява і інш. Дадзеныя аўтары належаць да каталіцкай канфесійнай плыні, што абумоўлівае іх зварот да неатамісцкай традыцыі, якая панавала ў каталіцкім інтэлектуальным свеце ў гэты час.

Афіцыйным пачаткам з’яўлення неатамізму, які па сутнасці з’яўляецца працягам традыцыі тамізму, адаптаванай ў адносінах да праблем сучаснасці прынята лічыць агульна вядомую энцыкліку Лявона XIII “Aeterni Patris”, што заклікае да адраджэння, папулярызацыі і актыўнага выкарыстання філасофскай спадчыны Тамаша Аквінскага.

У творчасці беларускіх аўтараў дадзеная тэматыка распрацоўвалася ў анталагічным, гнасеалагічным і сацыяльным аспектах.

Анталагічны аспект знайшоў адлюстраванне ў творчасці а.Фабіяна Абрантовіча, а.Яна Тарасевіча, а.Чэслава Сіповіча, а.Льва Гарошкі, а.Тамаша Падзявы і інш. Трэба адзначыць характэрнае для творчасці дадзеных аўтараў выкарыстанне прынцыпаў супадзення існасці і існавання ў Абсалюце [1, с. 20], дуалізму сусвету [1, с. 8], прынцып крэацыянізму і лесвіцы іерархіі быцця, дзе кожная рэч займае належнае месца ў залежнасці ад ступені аддаленасці ад Абсалюту [2, с. 4]. Найбольш поўна ў беларускай думке ўвасобіўся прынцып разгляду Абсалюту ў якасці самаіснавання.

Антрапалагічны аспект закранае тыповую для хрысціянства тэматыку злучэння духовага і цялеснага пачаткаў ў якасці адзінай субстанцыі, характэрную ідэю аналогій быцця Абсалюту і чалавека ў згоднасці з 24 тамісцкімі тэзісамі, ідэю інтэнцыянальнасці душы, якая ў творах некаторых аўтараў (а. Ян Тарасевіч [3, с. 27], а.Леў Гарошка [4, с. 1]) трансфармуецца ў пачуццё рэлігійнага інстынкту, характэрнае для неатамізму апраўданне чалавека яго творчасцю. Дадзеныя прынцыпы ўвасобіліся ў творчасці а.Яна Тарасевіча, а.Фабіяна Абрантовіча, а.Льва Гарошкі і а.Чэслава Сіповіча. У той жа час трэба адзначыць, што ў дадзеным аспекце беларуская рэлігійна-філасофская думка не змагла зрабіць пераход ад арыстоцелеўскага тыпа неатамізму да экзістэнцыяльнага, застаючыся ў межах класічнай традыцыі.

Скрупулёзна такімі беларускімі прадстаўнікамі, як а.Фабіян Абрантовіч [5], а.Адам Станкевіч [6], а.Леў Гарошка [7], распрацоўваўся гнасеалагічны аспект, сутнасць якога складае праблематыка ўзаемаадносін ісцін Аб'яўлення і навукі, увасобленая ў прынцыпе гармоніі праўд веры і розуму. Акрамя вышэй пазначанай тэндэнцыі, якую можна разглядаць у якасці цэнтральнай, трэба адзначыць зварот да такіх прынцыпаў, як магчымасць пасрэднага пазнання Абсалюта [8, с. 2], у тым ліку і шляхам традыцыйных пяці тамісцкіх разумовых доказаў існавання Абсалюта [9, с. 3]. У рэфлексіі беларускіх аўтараў прысутнічае характэрны для тамізму прынцып іерархічнасці, у згодзе з якім, класіфікацыя навук выглядае наступным чынам: навука-філасофія-тэалогія, дзе за вобласцю навукі замацоўваецца эмпірычны аспект, філасофія займаецца тэорыяй, а тэалогіі належа поле звышнатуральнага [7, с. 10].

Грамадская думка беларускіх аўтараў адзначалася большай схільнасцю да неатамістычнай версіі вучэння Тамаша Аквінскага. Так трэба адзначыць выразны ўплыў Жака Марітэна і яго тэорыі інтэгральнага гуманізму, які разглядае гісторыю заходней цывілізацыі ў якасці рэгрэсу, пачаткам якога з’явілася эпоха Адраджэння і ўласцівы ёй антрапацэнтрычны гуманізм. Беларускія аўтары прытрымліваюцца пункту гледжання тэакрэацыянісцкага генэзіса ўлады [2, с. 16], каштоўнасцяў дэмакратычнай дзяржавы, палітыка і ідэалогія якой павінны быць фундзіраваныя хрысціянскімі каштоўнасцямі [10, с. 7], супадаючы ў гэтым з

прапанаванай неатамізмам тэорыяй новай тэацэнтрычнай дзяржавы, якая павінна быць хрысціянскай не па форме, але па зместу.

Такім чынам, на аснове вышэй прыведзенага матэрыялу трэба адзначыць усебаковае засваенне беларускай рэлігійна-філасофскай традыцыяй каталіцкага напрамку ідэй неатамізму адначасова з ухілам да яго класічнай арыстоцелеўскай версіі, што дазваляе разглядаць беларускі варыянт неатамізму ў якасці пераходнага тыпа ад арыстоцелеўскага да экзістэнцыяльнага.

1. *Абрантовіч, Ф.* Бог / Ф. Абрантовіч. – Вільно, 1928.
2. *Абрантовіч, Ф.* Чалавек. / Ф. Абрантовіч. – Вільно, 1928.
3. *Тарасевіч, Я.* Беларусы ў святле праўды / Я. Тарасевіч. – Вільно, 1935.
4. *Аніcько, Д.* Чалавек / Д. Аніcько // Хрысціянская думка – 1929. – № 14.
5. *Abrantowicz, F.* Kosciol a nauka. / F. Abrantowicz. – Wilno, 1912.
6. *Станкевіч, А.* Божае Слова: Эвангэліі і прамовы на нядзелі і сьвяты // З Богам да Беларусі / А. Станкевіч. – Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008.
7. *Гарошка, Л.* Навука і рэлігія / Л. Гарошка // Дретома-Друя, 1994.
8. *Надсан, А.* Пазнанне Бога / А. Надсан // Божым шляхам – 1965. – № 4.
9. *Сіповіч, Ч.* Бог / Ч. Сіповіч // Зьніч – 1951. – № 4–5.
10. *Зьніч В*. За хрысьціянскае сужыццё народаў // Божым шляхам –1953. – № 56.